Modern History Archives
Archiwa Najnowszej Historyi
Fond 411 sprava 390

Я Х А

Незалежная газета Случчыны
Ад выдаўца

№ 1
чэрвень
1990г.

Становішча ў краіне, горадзе і раене складанае. У гэтых умовах вырашана выдаваць "ЯХУ" /яха-гэта "ЭХО"/.

Наша газета не адлюстроўвае погляды той ці іншай партыі, фронта, саюза ці групы. Яна імкнецца да аб'ектыўнасці. Яна будзе змяшчаць карэспадэнцыі чытачоў без рэдакцыйных змен тэкста. Кожны сам павінен адказваць за свае думкі.

Навіны Случчыны.

1. Мяне хвалююць пустыя паліцы ў крамах нашага горада. Случчына за год мяса вытварае 24 тыс.тон. З іх 21 тыс. ідзе немаведама куды. Для горада і раена застаецца ўсяго 3 тыс. тон. Гэта недзе па 30 кіло мяса на чалавека ў год. Параўнаем: Кастрамская вобласць цяпер усяго 8 тысяч тон мяса. І там ужо пастаўлена пытанне аб скарачэнні паставак у другія рэгіены. Чаму не зрабіць гэта і ў нас? Чаму, напрыклад, на жыхара Масквы выдзяляецца больш за 100 кг. мяса ў год, а на жыхара Случчыны 30?

М. Случчанін.

2. Апаратчыкі ўжо падрыхтаваліся да павышэння цэн. Яны павысілі сабе аклады ў два разы. А як быць нам?

В. Васілевіч.

3. 16 чэрвеня "Шлях Ільіча" надрукавала матэрыялы чарговага пленума Гаркома КПБ пад загалоўкам "На парадку дня-абнаўленне". Там сказана: выхад камуністаў з партыі на Случчыне ўзмацняецца. Летась за год 50 камуністаў здалі партбілеты. А селета толькі за чатыры месяцы з партыяй развіталася 70 чалавек. 76 працэнтаў з іх камуністы з партыйным стажам звыш 10 гадоў. Прычыну выхада камуністаў з партыі трэба шукаць не ў разгубленасці і не ў іх маральных якасцях, а ў тым, што партыя да гэтага часу фактычна падзелена на так званы актыў і пасіў, на тых камуністаў, якія ўсе жыцце толькі кіруюць і на тых, якія павінны ўсе жыцце толькі падтакваць кіраўнікам і плаціць узносы. Каб у партыі была ратацыя кадраў і існавала роўнасць паміж камуністамі не па паперах, а на справе, то выпадкаў выхаду з партыі было б меней ці зусім іх не было б.

"Нельга абыйсці,-гаварыў на пленуме З.К.Ломаць,-факт стварэння ў Слуцку групы падтрымкі Народнага фронта. З.К.Ломацю думаецца, вядома, што на Случчыне створана не група падтрымкі Народнага фронта, а раенна-гарадская рада БНФ, якая ў красавіку аб'ядноўвала 11 сфармаваных груп падтрымкі БНФ і звыш 10 груп, якія знаходзіліся ў стадыі фармавання. Гэтыя групы створаны на прадпрыемствах, ва ўстановах і па месцу жыхарства. Кіраўнікоm рады БНФ Случчыны абраны В.В.Траневіч. Абраны і два яго памочнікі. Колькі груп падтрымкі БНФ дзейнічае сення на Случчыне/на 18.06.90г./-гэтага я не ведаю, але іх, відаць, не адна, як сцвярджае Ломаць, а недзе каля 20.

"Мітынговы запал пройдзе",-сказаў Ломаць на пленуме. Мітынгаў у Слуцку яшчэ не было. А тое, чаго не было, не можа прайсці.

Гатоўнасць да дыялогу з мясцовым БНФ, выказаная парткіраўніцтвам Случчыны, можна ўхваліць, калі яна не дэкларатыўная. Час зразумець: рада БНФ Случчыны-першая раенна-гарадская непадкантрольная партыі", арганізацыя. Гэта новая зьява ў жыцці горада і раена за апошнія больш як семдзесят гадоў. І з ею трэба лічыцца. Трэба прымаць яе, усур'ез. Інакш у Слуцку пачнецца мітынговы запал. Канструктыўнымі былі

на пленуме гаркома выступленні дэлегата XXVIII з'езда КПСС Уласаўца, камуніста Шулякоўскага і іншых. Выдавец „Яхі"

4. На працягу некалькіх стагоддзяў адным з асноўных культурных цэнтраў Слуцка была гімназія-навучальная ўстанова, якая заснавана ў нашым горадзе каля 400 гадоў назад. Цяпер усюды адкрываюць гімназіі а ў Слуцку не варушацца. Салігорск ужо перахапіў педвучылішча, якое да вайны працавала ў нашым горадзе. Калі ж у Слуцку перастануць спаць у шапку?

А. Ліцэвіч.

5. Летась у Слуцку пачалі будаваць будынак для ваенкамата. Выкапалі катлаван, навазілі пяску, прывезлі сваі. Усяго выканалі работ на 20 тыс. руб. А цяпер усе закінулі. Кажуць: замаразілі будаўніцтва Замаразілі ці змарозілі? Відаць, змарозілі. Бо закапалі ў зямлю 20 тыс. рублеў. Цэлы катэдж! Трэба канчаць будаўніцтва ваенкамата, што дасць для вырашэння жыллевай праблемы ў горадзе? А вось што. У праўляны будынак дзе цяпер працуе ваенкамат, трэба будзе перасяліць чыноўнікаў з будынка былой вячэрняй школы, а будынак вячэрняй школы аддаць 15 маладым сем'ям. Гэты будынак быў некалі інтэрнатам. Не надта сучасны інтэрнат гэты, але лепш чым нічога.

Р. Цімкавец.

ВЕРШАВАНАЯ СУМЕСЬ.

x x x

Калі стане чыстым смярдзючы Бычок?
Каго не спытаеш-маўчок і маўчок.
Я чуў як казалі, што нават Рубцоў
Ні можа знайсці тут ніякіх канцоў.

Гэты верш быў складзены 25 гадоў назад, калі старшынею гарвыканкома быў Рубцоў. І сення рэчачка Бычок застаецца забруджанай. Ці знойдзе старшыня гарвыканкома Нікалаеў канцы?..

x x x

У Слуцку кожнага мужчыну
Каханне рэжа без нажа,
Бо тут жанчыны як багіні,
А штодзяўчына, то княжна.

Адказ на выклік на дуэль.

Дон Гавэнда, на дуэль вас выклікаю
Зброя можа быць любая.
/М. Танк. "Выклік на дуэль".

Выклік улічым, дон Бандэс,
Але я вам не Дантэс.
Не хачу асіраціць я-
Вашых дзетак і кабету.
Танк любы магу спаліць я,
Калі выпушчу ракету.

Р. Лінкор.

Кошт аднаго экземпляра 30-35 кап. Без матар'яльнай падтрымкі чытачоў "Яха" доўга не пратрымаецца. Ахвяруйце свае капейкі на выданне "ЯХІ"! Свае карэспандэнцыі дасылайце па адрасу: Слуцк, Рэвалюцыйная 1, кв. 53. Звоніце па тэлефоне 5-42-66.

Выдавец Р. Лінкор.

History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
fond ....... sprava .......

Бібліятэка Слуцкай Рады БНФ